УДК:7.046.1

**А. А. Карэньгіна, А. А. Філіч, К. Т. Лабан** (Мінск)

# БЕЛАРУСКАЯ МІФАЛОГІЯ Ў ФАЛЬКЛОРНЫМ ЗАПІСЕ

Міфалогія – сістэма міфаў і ўяўленняў пра навакольны свет, з'яўляецца адной са славянскіх міфалогій і, шырэй, адной з індаеўрапейскіх [1]. Як лічаць аўтары энцыклапедычнага слоўніка "Беларуская міфалогія", "міфалогія, як, бадай, ні адна іншая сфера культуры, мае заўсёды даволі высокі рэйтынг цікавасці з боку самай шырокай публікі" тым больш, што старажытныя (і сучасныя) міфы трывала злучаныя з разнастайнымі сферамі жыцця грамадства і выступаюць своеасаблівым спосабам пазнання "структуры ўсяго ўніверсуму" [2, с. 5]. Міфы існавалі ва ўсіх народаў свету. Старажытныя паданні пра справы багоў і фантастычныя істоты тлумачылі многія з'явы таго часу. Яны спрыялі арганізацыі калектыву, з'яўленню каштоўнасцей, падтрыманню захавання грамадскай і маральнай згуртаванасці, паколькі асновай міфа з'яўляліся не толькі страх і бяс-

сілле чалавека, але і мара аб валоданні моцай і магчымасцямі прыроды. У гэтым значэнні міфы былі стабілізатарам жыцця, забяспечвалі ўнутраную згоду паміж чалавекам і прыродай [7].

Аднымі з самых цікавых складнікаў міфалогіі з'яўляюцца повесці пра духаў. В. С. Новак, аўтар "Славянскай міфалогіі" на матэрыяле, сабраным у Гомельскай вобласці, робіць выснову, што "…менавіта для славянскіх народаў характэрна шырока распрацаваная народная міфалогія. Нават пасля прыняцця хрысціянства міфалагічныя аповеды пра духаў розных локусаў, ведзьмаў, русалак і інш. Працягвалі сваё актыўнае бытаванне ў народнай свядомасці" [8, с. 5]. Таксама гэтыя істоты маюць розныя найменні па месцы пражывання, напрыклад, духі лесу, балота, рэк, азер, хаты, поля і інш. [1]. Не ўсе міфічныя персанажы былі роўныя рангам, не ўсе мелі аднолькавую папулярнасць у народзе. Пра адных у народнай памяці засталося ўсяго па некалькі радкоў, пра другіх можна было б скласці цэлыя кнігі. Здаралася, што адзін і той жа персанаж бачыўся ў розных мясцовасцях па-свойму, мог мець супрацьлеглыя характарыстыкі знешнасці і нораву. Зараз фальклорныя запісы, у тым ліку пра духаў, выкарыстоўваюцца для напісання літаратурных твораў, дзіцячых кніг, казак. Справа ў тым, што сучасная культура значна больш самакрытычная і рацыяналістычная, любое сцверджанне і мысленне падвяргаецца аналізу. Яна дапускае існаванне розных поглядаў і прынцыпаў, але знойдзецца мала міфаў, якія б сучаснікі лічылі праўдай. Сучасная міфалогія адрозніваецца ад старажытнай, яна не з'яўляецца асновай усёй культуры. Міфы ў наш час выкарыстоўваюцца часцей за ўсё як узмацняльнік каштоўнасцей. Яны прадстаўляюць вераванне, надаюць прэстыж традыцыям, вучаць правілам паводзін [7].

Тым больш узрастае актуальнасць даследавання міфалагічных уяўленняў беларусаў, якія можна рэканструяваць праз фальклорныя запісы. Міфалагічныя істоты прысутнічаюць у выхаванні малодшага пакалення літаральна з дзяцінства праз казкі, гутаркі старэйшага пакалення пра містычныя з'явы і пад. Істотна, што беларуская традыцыйная культура вылучаецца незвычайнай глыбінёй фальклорнай "памяці" [2, с. 3]. З гэтай прычыны скрупулёзна сабраныя сучасныя фальклорныя запісы даюць каштоўныя звесткі пра старажытныя ўяўленні нашых продкаў, дазваляюць выявіць адметнасці беларускай міфалогіі і супаставіць з ужо распрацаванымі характарыстыкамі міфічных істот.

Усяго намі прааналізавана тры аповеды пра духаў леса, балота, хаты, запісаныя ад жыхароў вёскі Наваселле (Мінская вобласць, Мінскі раён): тры жанчыны ўзросту ад 50–90 гадоў, настаўніцы Навасельскай сярэдняй школы.

Да духаў лесу належаць Лясун (Лесавік, Лешы, Верасовы Дзядок, Лясны Дзед, Лясны Хазяін) – гаспадар лесу [2, с. 285; 3, с. 50; 6]. У асноўным старэйшае пакаленне часта згадвае пра Лесавіка, які мог як дапамагчы знайсці выхад з ляснога гушчару, калі лічыў асобу добрым чалавекам, або наадварот – завесці яшчэ больш у лес, калі чалавек падаваўся злым. Вось фрагмент адной з такіх размоў, запісанай намі:

– Марыя Грыгор'еўна, скажыце, ці сустракалі вы Лесавіка?

– ...Яго заўсёды можна сустрэць, калі ходзіш па грыбы. Насамрэч, Лесавік вельмі часта дапамагае грыбнікам, таксама і мне дапамог – я тады ледзьве ў дрыгву не трапіла. Малая тады была, дык мне Лесавік і дапамог, вужыка прыслаў, так я на яго звярнула ўвагу, бо маці гаварыла, што змеі з жоўтымі або ярка-аранжавымі плямамі жывуць каля балот. Я тады яшчэ громка сказала: "Маці, глядзі якая змейка!". Мая маць падбегла да мяне і ў сторану, бо заўва-

жыла, што я каля балота стаю і змяю разглядаю. Потым яна доўга прычытала і гаварыла, каб я дзядулю Лесавіку дзякавала. Вось так адбылася мая першая сустрэча з гаспадаром лесу. …Пра тое, што ён з імі/вужамі/сябруе, мала хто памятае. …Калі пойдеш у лес, вітайся з гаспадаром лесу, тады ён заўжды дапаможа табе, калі спатрэбіцца[1].

У табліцах атрыманыя ад інфармантаў звесткі супаставім з характарыстыкамі, распрацаванымі ў даведніках і слоўніках па міфалогіі. Супастаўленне правядзём паводле наступных параметраў: функцыя істоты, знешні выгляд, спосаб камунікацыі – прагнаць або зняць чары, задобрыць або дамовіцца. Вылучаныя крытэрыі параўнання дазваляюць найбольш поўна апісаць міфалагічную істоту, выявіць яе спецыфічныя рысы.

| Лесавік | У апавяданні | У беларускай міфалогіі |
|---|---|---|
| Функцыя | Дапамагае добрым людзям, а злых не шкадуе. Вельмі любіць дзяцей | Часцей істота не мэтанакіравана шкодная людзям, а гарэзлівая, але якая робіць гэта груба і зло. З іншага боку, Лесуна лічылі справядлівым гаспадаром лесу, які не стане шкодзіць проста так, але можа пакараць за неналежныя паводзіны ў яго ўладаннях, а можа і дапамагчы чалавеку |
| Знешні выгляд | Быў у форме жывёлы (вужа) з ярка-аранжавымі плямамі на галаве | Прадстаўлены ў выглядзе раслiннай або жывёльнай істоты. Таксама ён можа з'явіцца ў выглядзе родных або знаёмых. Апісваецца і як гігант, і як карлік, ёсць меркаванне, што ён мог змяняць свой рост. Калі Лесавік апрануты, то ён падобны да чалавека |
| Спосаб прагнаць або зняць чары | У размове не згадвалася | Лічылася, што пазбавіцца ад Лесавіка можна з дапамогай малітвы, мацернай брані або абярэгаў. Як нагода для «выкрадання» разглядалі праклён у выглядзе пасылання «да лясуна». Каб знайсці зніклых, рабілі не толькі звычайныя пошукі, але і здзяйснялі абрад «адвядзення» – падавалі дар або пагражалі магіяй або заступніцтвам святых |
| Спосаб задобрыць або дамовіцца | Павітацца, падзякаваць | Па народных паданнях лясун мог забяспечыць поспех на паляванні і шчасны выпас жывёлы, для гэтага паляўнічым і пастухам было неабходна прынесці яму дар і заключыць з ім дагавор [6] |

Натуральна, што атрыманая з аповеду інфарманта характарыстыка Лесавіка больш вузкая ў параўнанні з агульнай міфалогіяй. Тым не менш фальклорныя запісы паказваюць, што функцыі Лесавіка супадаюць з агульнымі міфалагічнымі ўяўленнямі. Знешні выгляд у беларускай міфалогіі шматварыянтны, а са слоў аўтара аповеду мы можам адразу даведацца, што перад намі Лясун. Паводле табліцы можна сказаць, што інфармант не сустракаўся са злым Лесуном, аўтар прапануе сябраваць з гаспадаром лесу.

Згодна з многімі народнымі ўяўленнямі вада адна з асноўных касмічных стыхій. У беларускай міфалогіі вада звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету, з пераходам у іншасвет і з многімі другімі рэчамі [2, с. 57]. І людзі не маглі не насяліць яе жыхарамі. І ў каждым вадаёме з'явіўся міфічны гаспадар, дух, увасабленне разбуральнай, варожай чалавеку стыхіі вады – Вадзянік. У яго многа найменняў: Вадзяны, Вадзяны Дзед, Вірнік, Амутнік, Ціхоня [2, с. 59; 3, с. 69; 8, с. 13].

[1] Тут і далей у запісах размоў захоўваюцца асаблівасці маўлення інфармантаў.

Пры размове з нашай знаёмай, нас зацікавіла тэма пра балота, бо ў яго таксама павінны быць духі. Прывядзём фрагмент размовы пра Вадзяніка: "...Памятаю ты ў мяне пра духаў балот пытала, але я нічога пра іх ня ведала. Аднак, магу расказаць пра Вадзянога дзеда або як яго яшчэ клічуць Вадзянік. Дык вось у месцы, дзе я раней жыла, працякала невялікая рачушка, але ўся вёска яе любіла, бо ў той было шмат рыбы, да і купацца мы любілі. ...Вось нам тады дарослыя сказалі не падхадзіць, бо ў гэты час усе духі найбольш актыўны, асабліва Вадзяны Дзед. Але мы тады вырайшылі паглядзець на яго і так здарылася, што ён разлаваўся на нас і абліў вадой. Нам тады было не так весела, як зараз табе, так? ...Скажу адно, мне тады здарылася, што там была вялізарная рапуха".

| Вадзянік | У апавяданні | У беларускай міфалогіі |
|---|---|---|
| Функцыя | Любіць водных жывёл раззлаваўшыся, можа абліць вадой | Любіць паджартаваць над людзьмі, што прыйшлі да месца яго пражывання. Пры неабходнасці ён можа ствараць магутныя водныя плыні, падымаць моцныя хвалі і нават вывесці возера, сажалку або раку з берагоў. Акрамя таго, у падпарадкаванні духу знаходзяцца ўсе істоты, якія насяляюць вадаём (ад рыб да тапельцаў і русалак) [2, с. 59] |
| Знешні выгляд | Велізарная рапуха | Можа лёгка мяняць свой воблік, ператварацца ў жывёл, рыб і нават дрэвы [4].<br>Глыбокі стары сярэдняга росту, з доўгай барадою, з доўгімі валасамі на галаве, з бліскучай шкурай, расплывістым тварам, азызлым пузам, доўгімі нагамі, перапонкамі [3, с. 69] |
| Спосаб прагнаць або зняць чары | У размове не згадвалася | У вадзе змагацца з вадзяным немагчыма, аднак пры неабходнасці яго можа адпудзіць медзь або жалеза, што толькі моцна яго раззлуе. Па гэтай прычыне ў старажытнасці гаспадара вадаёма аддавалі перавагу не раздражняць. Каб скінуць дзеянне чар вадзянога, можна ўкалоць сябе металічнай іголкай – тады на адно імгненне адкрыецца сапраўднае яго аблічча, і чары спадуць [4] |
| Спосаб задобрыць або дамовіцца | У асаблівыя дні не падыходзіць да вады. У гэтыя ж дні пакідаць сала на пяшчаным беразе | Аддавалі перавагу залагоджваць рознымі гасцінцамі – кідалі ў ваду хлеб ці чорную жывую істоту (курыцу або кошку) [4] |

Такім чынам, функцыі Вадзяніка ў фальклорным запісе і звестках па міфалогіі амаль падобныя паміж сабой, а вось знешні выгляд можа шырока вар'іравацца паводле агульных міфалагічных даных. У нашым запісе Вадзяны прадстаўлены канкрэтнай істотай – рапухай. І ў аповедзе, і ў даведніках па міфалогіі адзначаецца, што Вадзянік можа раззлавацца, спосаб задобрыць або дамовіцца ў двух выпадках таксама даволі канкрэтны і падобны.

Галоўная частка жыцця кожнага чалавека праходзіць у хаце, таму вельмі важна каб у ёй быў лад і спакой. У даўнія часы залогам добрага жыцця лічылі сяброўства з Хатнікам. Ён аберагаў ад зла і за малымі дзеткамі прыглядаў, сварыліся з ім толькі дурні. У Хатніка таксама ёсць і другія мянушкі: Дамавік, Гаспадар, Падпечнік [2, с. 528; 8, с. 122]. У міфалагічных уяўленнях беларуса Хатнік надзяляецца ўсімі якасцямі дбайнага гаспадара [3, с. 13].

Пахадзіўшы яшчэ па вяскоўцах, Аляксандра вырайшыла зайсці да суседкі, яна як чалавек дасведчаны, расказала ёй пра духаў хаты, фрагмент аповеду прыводзім ніжэй:

– Ганна Станіславаўна, адкажыце, а вы ведаеце пра якіх-небудзь хатніх духаў?

– Хм, чаму раптам пытаеш пра іх? Хаця я не супраць адказаць на гэтае пытанне. Хатнія духі бываюць розныя, напрыклад, той жа самый Дамавік або Хатнік, называй як хочаш. У агульным сама ведаеш, што ён жыве ў кожнай сям'і, і яны адрозніваюцца адзін ад іншага. Таксама яны могуць быць як злымі, так і добрымі. У асноўным Дамавікі любяць дзяцей і жывёл. Хм, мабыць людзям са злымі намерамі не даруе, а так заўсёды прыйдзе на дапамогу сваёй сям'і, якая трапіла ў бяду. Магчыма ёсць яшчэ якія-небудзь сведкі пра Дамавіка, але гэта ўсе, што я ведаю.

– Дзякуй вам. Скажыце, ці можа Дамавік сысці з дому?

– Ну, гэтага я не ведаю, мабыць, можа. Думаю, калі яго пакрыўдзіць тады да, пакіня гэтую хату і яе ўладальнікаў.

– Цяпер, я зразумела, што з Дамавіком лепей сябраваць, чым стаць ворагамі.

– Да, бо ён памочнік у гаспадарцы па хаце.

| Хатнік | У апавяданні | У беларускай міфалогіі |
|---|---|---|
| Функцыя | Любіць дзяцей і жывёл. Памочнік у гаспадарцы па хаце. Заўсёды прыйдзе на дапамогу сваёй сям'і, калі яна трапіла ў бяду. Людзям са злымі намерамі не даруе | Захавальнік дома і ўсяго, што ў ім знаходзіцца. Магчымасць прадказваць будучыню, але галоўнае, вядома, гэта мудрасць і ўменне лячыць людзей і жывёл |
| Знешні выгляд | У кожнай хаце хатнік свой, адрозніваюцца выглядам | Выглядае дамавік як маленькі стары (ростам 20–30 см) з вялікай барадой. Лічыцца, што чым старэй дамавік, тым маладзей ён выглядае, паколькі нараджаюцца яны старымі, а паміраюць немаўлятамі |
| Спосаб прагнаць або зняць чары | Калі пакрыўдзіць, тады можа пакінуць хату і яго гаспадара | Забіць хатняга духа немагчыма, але можна адпудзіць жалезам. Дамавік не нападае на людзей і таму змагацца з ім не трэба |
| Спосаб задобрыць або дамовіцца | З ім лепей сябраваць, чым стаць ворагамі | Калі дамавік раззлаваўся, то яго неабходна задобрыць, паднёсшы ў падарунак кашу, хлеб з соллю, курыны пірог або нюхальны тытунь і ветліва папрасіўшы прабачэння [5] |

Такім чынам, з табліцы можна зразумець, што функцыі Хатніка з дзвюх крыніц дапаўняюць адна адну. Напрыклад, звесткі ад інфарманта пра тое, што Хатнік заўсёды прыйдзе на дапамогу сваёй сям'і ў бядзе, з даведнікаў па міфалогіі дапаўняюцца магчымасцю прадказваць будучыню. У адрозненне канкрэтнага апісання знешнасці папярэдніх духаў, згаданых у аповедах, у гэтым фальклорным запісе знешні выгляд Дамавіка прадстаўлены абстрактна: істота прымае выгляд такі, які супадае з разуменнем гаспадара. У агульнай жа міфалогіі дух

хаты перададзены даволі канкрэтным антрапаморфным апісаннем. Звесткі пра Хатніка аб'ядноўвае інфармацыя пра неабходнасць для гаспадара сябраваць з гэтым духам.

Як адзначаюць даследчыкі, міфалагічныя ўяўленні пра духаў як фрагмент народнай культуры маюць шырокую геаграфію распаўсюджвання і багатую лакалізацыю (духі лесу, вады, хаты), яшчэ недастаткова вывучаны і маюць вялікія перспектывы для даследавання [8, с. 6]. Апрацоўка многіх фальклорных запісаў дазваляе сістэматызаваць і канкрэтызаваць уяўленні аб міфалагічных стварэннях. З фальклорных запісаў вынікае, што ў кожным месцы сваё разуменне, як жыць побач з духамі, наладжваць кантакт: як пазнаць, дамовіцца, змагацца, задобрыць.

Міфалогія – важны фактар у фарміраванні чалавечага светапогляду і прадстаўлення свету, яна дапамагае развіваць фантазію, дабрыню, забяспечвае ўнутраную гармонію паміж чалавекам і прыродай, што сведчыць пра актуальнасць правядзення падобных даследаванняў.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская міфалогія [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: be.wikipedia.org/wiki/Беларуская_міфалогія.
2. Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.
3. Беларуская міфалогія : дапам. / уклад. У. А. Васілевіч. – 2-е выд. – Мінск : Універсітэцкае, 2002. – 208 с.
4. Водяной [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.anews.com/p/131287551-kto-takoj-vodyanoj.
5. Домовой [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://bestiaria.ru/wiki/Мифология/Славянская_мифология.
6. Леший [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www. mythological-creations.fandom.com/ru/wiki/Леший.
7. Мифы в современном мире [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://scienceforum.ru/2016/article/2016024909.
8. *Новак, В. С.* Славянская міфалогія (на матэрыялах Гомельскай вобласці) / В. С. Новак. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – 329 с.